## ВАРТА ПАЗНАЕМІЦЦА:

"Калібры»". 1960 г.

"Кватэра № 3". 1961 г.

"Мера часу»". 1962 г.

"Экзамен". 1963 г.

"Ларыса". 1964 г.

"На струнах буры". 1967 г.

"Сярод ночы". 1968 г.

"Іскры ў папялішчы". 1970 г.

"Ваўчкі". 1972 г.

"Сіні бор". 1972 г.

"Мне трэба ехаць". 1974 г.

"Стану песняй". 1977 г.

"Сузор'е Вялікай

Мядзведзіцы". 1980 г.

"Паласа дажджу". 1984 г.

"Пошукі кахання". 1987 г.

**Крыніца:**
Пісьменнікі Беларусі / Вікіпедыя — шматмоўная, свабодная інтэрнэт-энцыклапедыя


ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ
РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»

ЦЭНТР МЕДЫЯРЭСУРСАЎ
І БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ

Рэспубліка Беларусь
220104, г. Мінск, вул. П. Глебкі, 88

тэл. +375 17 365 42 85
факс: +375 17 216 97 10
E-mail: bibliotekamoiro@yandex.ru
http://www.moiro.by/



ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«МІНСКІ АБЛАСНЫ ІНСТЫТУТ
РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ»

ЦЭНТР МЕДЫЯРЭСУРСАЎ
І БІБЛІЯТЭЧНАЙ РАБОТЫ




## СЛАВУТЫЯ ПІСЬМЕННІКІ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ



# ЛІДЗІЯ АРАБЕЙ

# ЛІДЗІЯ АРАБЕЙ - ПІСЬМЕННІЦА



Лідзія Львоўна Арабей (27 чэрвеня 1925, в. Нізок, Уздзенскі раён — 20 лютага 2015, Мінск) — беларуская пісьменніца і літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук (1958).

У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ў Шчучыне Гарадзенскай вобласці (1942-1944). Пасля вызвалення (1944) - супрацоўнік рэдакцыі шчучынскай раённай газеты «Чырвоны сцяг». З 1945 г. жыла ў Мінску.

Працавала ў часопісе «Вожык», у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», настаўнічала. У 1951 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1954 г. - аспірантуру пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР.

Была старшым рэдактарам выдавецтва «Беларусь» (1955-1967), супрацоўнікам часопіса «Полымя» (1967-1974). Кандыдат філалагічных навук. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1958 г.

Член Саюза беларускіх пісьменнікаў.






Літаратурную працу пачала ў 1945 г.

Выступае як празаік, крытык, літаратуразнавец. У 1956 г. выдала даследаванне «Цётка (Алаіза Пашкевіч)», у 1959 г. - крытыка-біяграфічны нарыс «Хвядос Шынклер». Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Мера часу» (1962), «Экзамен» (1963), «Ларыса» (1964), «Ваўчкі» (1972), «Сярод ночы» (1968), «На другой зіме вайны» (1968), «Мне трэба ехаць» (1974), «Паласа дажджу» (1984), «Пошукі кахання» (1987), дакументальных аповесцей пра Цётку «На струнах буры» (1967) і «Стану песняй» (1977), раманаў «Іскры ў папялішчы» (1970) і «Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы» (1980), кнігі сатыры і гумару «Кватэра №– 3» (1961).

Выдала зборнікі апавяданняў для



дзяцей «Калібры» (1960), «Ісці ў разведку» (1989) і аповесць «Сіні бор» (1972). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1985).

Пераклала раман эстонскага пісьменніка А. Хінта «Бераг вятроў» (з А. Раманоўскай, 1960).

